

# Матэрыяльная спадчына роду Агінскіх у Беларусі

*Году гістарычнай памяці прысвячаецца*





ЗАЛЕССЕ
АБОРАК
МАЛАДЗЕЧНА
М.К. АГІНСКІ
ГУЗУЎ

Маладзечанскі мясцовы дабрачынны фонд
«Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага»

# МАТЭРЫЯЛЬНАЯ СПАДЧЫНА РОДУ АГІНСКІХ У БЕЛАРУСІ

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2022

УДК [78.071.1(476)+929Агінскі](084.12)
ББК 85.31(4Беи)я6
М35

Выданне падрыхтавана дзякуючы фінансавай падтрымцы
Кіруючай кампаніі холдынгу «БелГАЗавтосервис»
(старшыня Савета дырэктароў М. А. Супруновіч), Беларуска-германскага
вытворчага сумеснага прадпрыемства «Минский Мебельный Центр»
(генеральны дырэктар В. Ф. Курган), Вытворча-гандлёвага ўнітарнага
прадпрыемства «МИГ-ЛТД» (дырэктар Г. І. Мятліцкі)

**Укладальнікі:**
П. М. Сапоцька,
Р. С. Сарока

**Аўтары тэкстаў:**
Бурэнь Валерый Васільевіч,
Кляшчонак Таццяна Іванаўна,
Сапоцька Павел Міхайлавіч,
Тамашэўскі Мікалай Іванавіч

М35 **Матэрыяльная** спадчына роду Агінскіх у Беларусі / укл.: П. М. Сапоцька, Р. С. Сарока ; аўт. тэкстаў: В. В. Бурэнь, Т. І. Кляшчонак, П. М. Сапоцька [і інш.]. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2022. — 96 с. : іл.
ISBN 978-985-581-522-9.

Спадчына вялікага роду Агінскіх з'яўляецца ўнікальнай з'явай гісторыі і культуры ў розных краінах свету. У тым ліку і Беларусь захоўвае памяць аб выбітнай дынастыі, ушанаванай у выніках дзейнасці яе таленавітых прадстаўнікоў.

У выданні размешчана інфармацыя з ілюстрацыямі аб матэрыяльных помніках, узведзеных у Беларусі ў розныя перыяды прадстаўнікамі знакамітай дынастыі Агінскіх. Большасць з гісторыка-культурных каштоўнасцей не захавалася да нашых дзён, некаторыя помнікі адноўлены, частка чакае рэстаўрацыі.

Кніга будзе карыснай тым, хто цікавіцца гістарычнай спадчынай краіны.

**УДК [78.071.1(476)+929Агінскі](084.12)**
**ББК 85.31(4Беи)я6**

**ISBN 978-985-581-522-9**

© Сапоцька П. М., Сарока Р. С., укладанне, 2022
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва "Чатыры чвэрці"», 2022

# АД УКЛАДАЛЬНІКАЎ

*Памяці*
*шчырага папулярызатара спадчыны Агінскіх*
*Уладзіміра Сівухі прысвячаецца*

Беларуская культура і многія яе выдатныя праявы непарыўна звязаны з гучнымі імёнамі дзяржаўных дзеячаў, мецэнатаў і творцаў, якія ахвяравалі сілы, талент, інтэлект, энергію, сродкі ў імя росквіту сваёй краіны. Так, дынастыя Агінскіх пакінула яскравы след у яе культуры. Знакамітыя прадстаўнікі роду былі заснавальнікамі велічных палацаў, фундатарамі кляштараў, ініцыятарамі з'яўлення школ і бібліятэк… У Беларусі шмат месцаў, да гісторыі якіх спрычыніліся Агінскія: Залессе, Маладзечна, Гродна, Віцебск, Бешанковічы, Слонім, Бялынічы, Ганута, Смілавічы, Сянно…

На вялікі жаль, захаваліся толькі адзінкавыя помнікі, што паўсталі ў розныя гістарычныя перыяды. Шматлікія войны і жорсткі час зруйнавалі многія каштоўнасці. Аднак захавалася памяць пра іх на малюнках Напалеона Орды і Леанарда Ходзькі, фотаздымках пачатку XX стагоддзя, у апісаннях на старонках мемуараў, у асабістых архівах і навуковых даследаваннях. Культурная прастора і гістарычная памяць значна ўзбагаціліся творамі сучасных беларускіх мастакоў Галіны Бяганскай, Аляксандра Грышкевіча, Эдуарда Мацюшонка, Віктара Мікіты, Дар'і Бунеевай і іншых. Неабходна адзначыць грунтоўную працу рэстаўратараў па адраджэнні гістарычных аб'ектаў; навукоўцаў, якія штодня вывучаюць гісторыю краіны; выкладчыкаў, праз якіх абуджаецца цікавасць у моладзі да нашай культуры; мастакоў, якія пакідаюць нашчадкам палотны

з бессмяротнымі вобразамі; краязнаўцаў — «патрыётаў сваіх месцаў»…

У Год гістарычнай памяці ў Беларусі аўтары прадстаўленага выдання паспрабавалі пад адной вокладкай сабраць інфармацыю аб захаваных і знішчаных матэрыяльных помніках, непасрэдна звязаных з жыццём і дзейнасцю роду Агінскіх у межах сучаснай Беларусі. Дзякуючы руплівцам Таццяне Кляшчонак, Валерыю Бурэню, Мікалаю Тамашэўскаму быў назапашаны цікавы краязнаўчы і навуковы матэрыял, частку з якога мы прапануем чытачам.

***Рыгор Сарока, Павел Сапоцька***





# Залессе
## (Смаргонскі раён, Гродзенская вобласць)

Залессе належала Агінскім з першай паловы XVIII ст. Ад віцебскага ваяводы Марцыяна Міхала Агінскага (1672–1750), што атрымаў Залессе як шлюбны пасаг чацвёртай жонкі Тэклі Лярскай, пераходзіць у канцы XVIII ст. да сына ад першага шлюбу Тадэвуша Францішка Агінскага (1712–1783), старшыні Трыбунала Вялікага Княства Літоўскага, кашталяна і ваяводы Трокскага, які завяшчаў Залессе свайму малодшаму сыну Францішку Ксаверыю (1742–1814), вялікаму літоўскаму кухмайстру і «маладзечанскаму графу», а той у 1814 г. пакінуў Залессе ў спадчыну пляменніку Міхалу Клеафасу Агінскаму.

Вядомы палітычны дзеяч Рэчы Паспалітай, паўстанец і кампазітар Міхал Клеафас Агінскі (1765–1833) прыбыў на пастаяннае жыхарства ў Залессе ў красавіку 1802 г. як юрыдычны апякун свайго дзядзькі Францішка Ксаверыя і ўпраўляючы маёнткам. За ўдзел у нацыянальна-вызваленчым паўстанні 1794 г. маёнткі князя былі канфіскаваны, таму ён быў вымушаны пасяліцца ў драўлянай сядзібе Францішка Ксаверыя. Гэта быў стары аднапавярховы дом з калонамі і вальмавым дахам, узведзены яшчэ ў пачатку XVIII ст., відавочна, прадзедам Міхала Клеафаса Марцыянам Міхалам Агінскім. Да сядзібы з пярэдняга фасада (звернутага ў бок сажалкі) прымыкалі разнастайныя гаспадарчыя пабудовы, а з тыльнага боку размяшчаўся італьянскі парк у форме прамавугольніка, які з двух бакоў атачалі ліпавыя алеі. Іх абноўленыя фрагменты захаваліся да нашага часу. У сярэдзіне паркавага прамавугольніка раслі пладовыя дрэвы і ягадныя кусты. Міхал Клеафас засяліўся са сваёй другой жонкай Марыяй Нэры, удавой касцюшкаўскага паўстанца Каэтана Нагурскага, і адсюль кіраваў будаўніцтвам новай сядзібы — каменнага палаца і пейзажнага парку. Работы скончыліся да 1815 г. Палац пабудаваны па праекце вядомага віленскага архітэктара Міхала Шульца, работамі ў пэўны перыяд кіраваў віленскі архітэктар Юзаф Пусэ.

Верагодна, сярод прысядзібных пабудоў знаходзіліся таксама вадзяны млын і бровар. Маёнтак меў уласную цагельню на рацэ і тры карчмы. Сёння ад старой драўлянай сядзібы ацалеў толькі фундамент. Абрысы старадаўняга італьянскага парку захаваліся ў выглядзе ліпавых алей і сажалкі.

М. К. Агінскі арганізоўваў у маёнтку музычна-літаратурныя вечарыны, дзе выконваліся ў тым ліку і яго творы. Некаторыя гісторыкі лічаць, што менавіта тут быў напісаны і ўпершыню выкананы знакаміты паланэз «Развітанне з радзімай». Маёнтак часоў Агінскага атрымаў назву «Паўночныя Афіны».

З 25 верасня 2015 г. ацалелы палац славутага кампазітара, вядомага грамадскага і палітычнага

дзеяча канца XVIII — пачатку XIX ст. Міхала Клеафаса Агінскага ў Залессі стаў музеем-сядзібай. У палацава-паркавы комплекс уваходзяць таксама будынкі сямейнай капліцы Агінскіх (першапачаткова васьміграннай і дабудаванай наступнымі ўладальнікамі маёнтка), двухпавярховага вадзянога млына, мураванай стайні і сучаснай цяпліцы са шкла і бетону на месцы неацалелай цяпліцы Агінскага. Сядзіба размяшчаецца на тэрыторыі больш чым 20 га і ўключае ў сябе таксама сажалку з насыпным вострава м («Лебядзіным») і масіў дрэў на месцы былога пейзажнага парку, дзе захавалася старадаўняя паркавая планіроўка і некалькі ўпрыгожанняў: два памятныя камяні (у гонар Тадэвуша Касцюшкі і педагога Агінскага Жана Рале) і альтанка ў выглядзе грэчаскага храма (так званая «Альтанка Амеліі»).



Напалеон Орда
**«Залессе. Палац князёў Агінскіх»**
Другая палова XIX ст.

Экспазіцыя музея-сядзібы М. К. Агінскага прадстаўлена 13 заламі, аздобленымі цікавымі гістарычнымі артэфактамі і творамі мастацтва. Праводзяцца таксама часовыя выстаўкі твораў беларускіх мастакоў, музычныя вечары, творчыя сустрэчы і іншыя імпрэзы.





Леанард Ходзька



Садова-паркавы ансамбль у Залессі. XIX ст.





Леанард Ходзька
**«Залессе»**
1822 г.











Альтанка Амеліі



Кітайская альтанка











На адкрыцці музея-сядзібы. 2015 г.





Ансамбль «Амелія» падчас музычнай вечарыны ў Залессі. Кіраўнік Валерыя Маліноўская.
Фота Валянціны Свірыда



Віктар Мікіта
**«Від на палац Агінскага з каменем»**
Грунтаваная папера, алей. 90x65. 2015 г.



Дар'я Бунеева
**«Асенні снег у Залессі»**
Палатно, змешаная тэхніка. 120x143. 2015 г.




Галіна Бяганская
**«Зіма ў Залессі»**
Папера, акварэль. 41x57. 2018 г.




Галіна Бяганская
**«Сонечныя промні»**
Папера, акварэль. 57x41. 2020 г.




Аляксандр Грышкевіч
**«Залессе»**
Палатно, алей. 35х45. 2018 г.



Аляксандр Грышкевіч
**«Каплічка»**
Палатно, алей. 30х40. 2015 г.



Віктар Мікіта
**«Стайня сядзібы Агінскага ў Залессі»**
Грунтаваная папера, алей.
90x65. 2015 г.



Віктар Нямцоў
**«Вадзяны млын М. К. Агінскага»**
Палатно, алей. 23x25. 2019 г.

# Бешанковічы
## (Віцебская вобласць)

З канца XVII ст. князі Агінскія сталі ўладальнікамі Бешанковіч, якія на той момант ужо мелі статус мястэчка і магдэбургскае права на частковае самакіраванне. У 1708 г. у гонар наведвання пасялення Пятром І была пабудавана Петрапаўлаўская царква.

Першы ўладальнік — віленскі ваявода Казімір Дамінік Агінскі (?–1773) — зрабіў Бешанковічы адной са сваіх пастаянных рэзідэнцый. З гэтай мэтай ён пабудаваў двухпавярховы каменны палац і заклаў рэгулярны парк, які тэрасамі спускаўся да берагоў Дзвіны. Гаспадарчая дзейнасць ваяводы прывяла мястэчка да эканамічнага росквіту: з сярэдзіны XVIII ст. яно атрымала статус горада (у некаторых крыніцах ёсць звесткі, што ўладальнікам Бешанковіч быў Міхал Казімір Агінскі). У 1775 г. пасля смерці зяця Казіміра Дамініка — віленскага кашталяна Ігнація Агінскага — Бешанковічы сталі ўласнасцю канцлера ВКЛ Яўхіма Храптовіча. Ёсць звесткі, што ў палацы на некалькі дзён спыняўся Напалеон Банапарт.

Палац у Бешанковічах ацалеў. Ён уяўляе сабой двухпавярховы каменны будынак у класічным стылі, пабудаваны ў форме прамавугольніка з выступаючым цэнтральным рызалітам і невялікім атыкам над уваходам. З абодвух бакоў прыбудаваны невысокія алкежы. Імя архітэктара невядома. Захаваўся малюнак канца XIX ст., зроблены мастаком Напалеонам Ордам, на якім каля палаца відаць і іншыя пабудовы, відавочна, гэта афіцыны.

Зараз палац працягвае служыць людзям: тут месцяцца дзіцячая школа мастацтваў і раённая бібліятэка.




Напалеон Орда
**«Палац Храптовічаў у Бешанковічах»**
1876 г.







Фота Сяргея Плыткевіча

# Маладзечна
## (Мінская вобласць)

Агінскія валодалі Маладзечнам каля 120 год. За гэты часператварылі яго з прыватнаўласніцкага мястэчка ў адметны горад з элементамі магдэбургскага права. Сярэдневечны замак быў перабудаваны ў свецкі палац, Маладзечна атрымала прывілей на два штотыднёвыя рынкі і на два штогадовыя кірмашы.

Дзяржаўны дзеяч Рэчы Паспалітай Тадэвуш Францішак Агінскі (1712–1783) пабудаваў у Маладзечне парафіяльны касцёл і кляштар трынітарыяў, пры якім была вялікая бібліятэка і парафіяльная школа. У 1811 г. дзякуючы намаганням Францішка Ксаверыя ў Маладзечна з Бабруйска было пераведзена шляхецкае павятовае вучылішча, дзе працавала студыя жывапісу, мелася бібліятэка, былі і музычныя інструменты, якія перадаў вучылішчу Міхал Клеафас Агінскі. Адсюль бяруць вытокі слынныя музычныя і мастацкія традыцыі горада.

У розныя часы маладзечанскімі ўладарамі былі прадстаўнікі многіх знакамітых родаў: Заслаўскія, Мсціслаўскія, Збаражскія, Пацы, знакаміты канцлер ВКЛ Леў Сапега. А з 1711 г. (па некаторых крыніцах, з канца XVII ст.) часткі Маладзечна, якія належалі асобным уладальнікам, Агінскія пачалі збіраць у адны рукі.

Замак рэканструяваны ў духу прагрэсу. У пачатку XIX ст. гэта быў ужо двухпавярховы палац з чатырма флігелямі, «дваром асобным ад іншых збудаванняў» і «шырокім садам». Менавіта садова-паркаваму мастацтву Агінскія надавалі шмат увагі. Двор палаца быў аздоблены дэкаратыўнымі пасадкамі і кветкамі, у садзе расло 66 гатункаў пладовых дрэў, быў вялікі гадавальнік. У аранжарэях вырошчвалі ананасы, лімоны, гранаты, апельсіны. Дакладна вядома, што апошнія пладаносілі.

У Францішка Ксаверыя Агінскага (1742–1814), дзядзькі кампазітара Міхала Клеафаса Агінскага, у палацы былі адведзены адмысловыя залы пад мастацкую галерэю (пераважна партрэты прадстаўнікоў роду), бібліятэку. Адна з залаў была прыстасавана пад тэатр. Павятовае шляхецкае вучылішча таксама



Уладзімір Лукша
**«Рэканструкцыя Маладзечанскага замка»**



Маладзечанскае замчышча

размясцілася ў палацы. Быў пракапаны падземны ход да кляштара трынітарыяў.

У апошнія гады свайго існавання замак перажыў шмат бурных падзей. Не паспелі яшчэ вучні і настаўнікі павятовага вучылішча асвоіцца на новым месцы, як грымнула вайна 1812 г. Першы летні вал вайны цудам мінуў Маладзечна (Баграціён, які вёў адступаючую армію ад Нясвіжа да Маладзечна, даведаўся, што ўтрая большыя сілы французаў перарэзалі яму дарогу, таму павярнуў на Койданава). Але другая хваля вайны — адступленне Напалеона — накрыла горад і замак, як кажуць, з галавой. Імператар, пераследуемы арміяй Чычагава, прыбыў у Маладзечна 21 лістапада (па старым стылі) і размясціўся са сваёй світай у палацы Францішка Ксаверыя Агінскага. Напалеон адразу ж папракнуў старога князя ў тым, што яго пляменнік Міхал Клеафас знаходзіцца ў Пецярбургу і больш давярае рускаму імператару, чым французскаму. На гэта Францішак Ксаверы мудра адказаў: «Французы прыйшлі і цяпер уцякаюць, народ жа застаецца, і таму мой пляменнік Міхал Клеафас паступіў правільна, як патрыёт, калі ў цяжкую для славянскіх зямель часіну прымкнуў да рускіх сяброў…»

Вельмі пацярпелі ў 1812 г. замак і горад: Маладзечна было амаль дашчэнту спалена, замак напалавіну разбураны, рэдка якія навакольныя вёскі ацалелі. Распараджэннем Кутузава насельніцтва было на нейкі час вызвалена ад падаткаў, горад пачаў пакрыху аднаўляцца.

А замак прыходзіў у заняпад. Стары і нямоглы князь Францішак Ксаверы не меў ні сілы, ні жадання рабіць рамонт. У хуткім часе ён памёр, а замак дастаўся ў спадчыну Міхалу Клеафасу Агінскаму. Князь у гэты час з вялікімі намаганнямі заканчвае будоўлю палаца ў Залессі, таму на рамонт маладзечанскага замка сродкаў у яго бракуе. Крыху падрамантаваўшы палац (1815 г.), Агінскі палову яго аддае павятоваму вучылішчу разам з бібліятэкай і музычнымі інструментамі. Потым ён пераходзіць у рукі графа Тышкевіча, які меў асноўную рэзідэнцыю ў Літве і не спяшаўся адраджаць замак. Так палац паступова знікае з маладзечанскай зямлі. Ужо ў 80-х гг. XIX ст. ад яго засталіся толькі земляныя валы і рэшткі дарогі ад замка да вілейскага гасцінца.

Справа, распачатая ўладальнікамі маладзечанскага замка, не прапала. Матэрыялізавалася яна ў комплексе кляштара і касцёла трынітарыяў, з якімі цесна звязаны навучальныя ўстановы.

На тэрыторыі сучаснага Маладзечанскага станкабудаўнічага завода, якая зараз недаступна для экскурсій, у XVIII–XIX стст. знаходзіўся адзін з цэнтраў культурнага і грамадскага жыцця горада. Тут былі размешчаны парафіяльны касцёл (перабудаваны потым у царкву), кляштар ордэна трынітарыяў, пошта. Недзе побач знаходзілася паштовая станцыя (так бы мовіць, тагачасны вакзал). Гэтае месца да Вялікай Айчыннай вайны было цэнтрам адукацыі горада. Менавіта тут Тадэвуш Агінскі, дзед кампазітара, пабудаваў кляштар трынітарыяў, пры якім была вялікая бібліятэка (994 тамы) і парафіяльная школа (прыблізны час існавання — 1762–1831 гг.).

Пасля вайны 1812 г. шляхецкае павятовае вучылішча таксама перабралася ў будынкі кляштара. У свой час яго скончылі многія вядомыя асобы. У прыватнасці, Тамаш Зан — адзін з лідараў філаматаў і філарэтаў, паэт, фальклярыст; Леанард Ходзька — асабісты сакратар М. К. Агінскага, выдавец мемуараў Агінскага, гісторык, публіцыст; Нікадзім Сільвановіч — мастак, аўтар мазаічных карцін у Ісакіеўскім саборы, акадэмік Санкт-Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. У 1839 г., вяртаючыся з Італіі, Маладзечна наведаў Мікалай Гогаль і застаўся задаволены «прекрасным училищем» і яго выкладчыкамі.

У 1860 г. павятовае вучылішча было зачынена, і на яго месцы некаторы час працавала прагімназія, якая рыхтавала шляхецкіх дзяцей да паступлення адразу ў шосты клас гімназіі. Навучаліся таксама настаўнікі царкоўнапрыходскіх школ з ліку дзяцей праваслаўнага духавенства.

І вось у 1864 г. у Маладзечне адчыняецца адна з першых у Расійскай імперыі настаўніцкіх семінарый. Гэта быў час школьнай рэформы — на змену аднагадовым прыходскім школам з'яўляюцца пачатковыя народныя вучылішчы-сямігодкі. У Віленскай навучальнай акрузе толькі за тры гады было адчынена каля 400 вучылішчаў. Настаўнікаў трэба было шмат. Па першым часе

іх рыхтавалі ўсяго за два гады (з 1870 г. — тры, з 1907 г. — чатыры гады). А ў Маладзечне былі ўжо ўласныя асветніцкія традыцыі, вольныя памяшканні (мураваны корпус і восем драўляных флігеляў былога кляштара, зачыненага пасля паўстання 1830–1831 гг.).

З часоў шляхецкага вучылішча захавалася добрая бібліятэка, у якой былі нават інкунабулы. Таксама ўлічваўся «здаровы клімат» — у Маладзечне дваццаць год не было халеры.

Праект праграмы для семінарыі склаў знакаміты рускі педагог К. Ушынскі, але ж пад уплывам улад «Северо-Западного края» яна набыла моцны вялікадзяржаўны і шавіністычны ўхіл. Прымаліся ў семінарыю юнакі праваслаўнага веравызнання, якія скончылі народнае вучылішча. Перавага аддавалася дзецям сялян.

Пры семінарыі існаваў выдатны хор Крачкоўскага. Нездарма ж са сцен семінарыі выйшлі такія знакамітыя спевакі, як М. Забейда-Суміцкі, які спяваў на 16 мовах, і В. Селях-Качанскі, саліст Марыінскага тэатра, пра якога Шаляпін казаў, што «Селях — адзіны чалавек, які можа мяне замяніць». Сярод выпускнікоў семінарыі таксама шмат выдатных дзеячаў свайго часу. Гэта і кіраўнікі Грамады С. Рак-Міхайлоўскі, П. Мятла, паэт М. Чарот, герой руска-турэцкай вайны 1877–1878 гг. К. Хруцкі, які пражыў 113 год, публіцыст, пісьменнік, старшыня Рады БНР Язэп Лёсік. У 1915 г. у сувязі з наступленнем немцаў семінарыя пераязджае ў Смаленск. За польскім часам у старых манастырскіх мурах размяшчалася гімназія імя Тамаша Зана, а ў 1939–1941 гг. — педагагічнае вучылішча імя Янкі Купалы. Сёння старажытны будынак у Маладзечне — помнік архітэктуры позняга барока — знаходзіцца па вуліцы Замкавай, 19 на тэрыторыі ААТ «Маладзечанскі станкабудаўнічы завод».

У 1823 г. касцёл Найсвяцейшай панны Марыі ў Маладзечне згарэў. Манастыр пры ім зачынілі і пазней перабудавалі ў царкву. У 1919 г. будынак касцёла пры былым манастыры зноў вярнулі каталікам пад імем Св. Казіміра. Пасля Другой сусветнай вайны яго разабралі і пабудавалі ліцейны цэх станкабудаўнічага завода, выкарыстоўваючы ацалелыя бакавыя сцены касцёла. Магчыма, у падзямеллях гэтага завода знаходзяцца пахаванні князёў Агінскіх.





Манастыр трынітарыяў у Маладзечне. Сёння — будынак ААТ «Маладзечанскі станкабудаўнічы завод»



Копія мемарыяльнай дошкі на будынку каледжа, усталяванай у 1996 г. у Фларэнцыі на доме па вул. Тарнабуоні, 10, дзе М. К. Агінскі пражыў апошнія 11 гадоў. Скульптар Валяр'ян Янушкевіч



Маладзечанскі дзяржаўны музычны каледж імя М. К. Агінскага





Помнік М. К. Агінскаму ў Маладзечне. Усталяваны ў 2001 г.
Скульптар Валяр'ян Янушкевіч. Фота Яўгена Стэльмаха

# Маёнтак Бакшты
## (Смілавічы і Дукора)

Бакштанская воласць упершыню згадваецца паміж 1440–1450 гг. як падараваная віленскаму кашталяну Кежгайлу. У канцы XV ст. на месцы Смілавіч узнікла паселішча знатных татар — Татарская Слабада.

У пачатку XVII ст. частку Бакштаў набыў Багдан Агінскі. Яго нашчадкі падзялілі спадчыну на часткі. У 1668 г. Марцыян Агінскі ахвяраваў валоку зямлі ў Смілавічах пад праваслаўную царкву, пабудаваў замак з валамі і бастыёнамі. Нашчадкаў Марцыян не пакінуў, і яго доля маёнтка адышла да пляменніка — Крыштофа Завішы. Ігнацы Завіша ў 1727 г. ажаніўся з Марцыбелай Агінскай, якая з 1738 г. стала адзінай спадчынніцай маёнтка. У 1747 г. яна заснавала ў Смілавічах кляштар місіянераў, для якога пабудавала велічны касцёл. У яго крыпце вяліся пахаванні Агінскіх, а пазней — Манюшкаў. Пры касцёле была створана школа. Паводле акта аб перадачы ўласнасці, маёнтак Бакшты ад Марцыбелы Агінскай атрымаў яе пляменнік Міхал Казімір Агінскі, вялікі гетман літоўскі. Смілавічамі і Дукорай ён прызначыў кіраваць сваіх былых афіцэраў — С. Манюшку і Ф. Оштарпа, якія ў 1791 г. сталі ўладарамі маёнткаў.

Гаспадар Смілавіч Станіслаў Манюшка паходзіў са збяднелага шляхецкага роду, ажаніўся з Евай Вайніловіч. Дзед славутага кампазітара. Апрача Смілавіч, Станіслаў атрымаў пасля М. К. Агінскага і іншыя землі: маёнткі Гудавічы, Данілава, Слабада, Каменка, Залессе, фальваркі Убель, Пуднік і іншыя. Ён энергічна ўзяўся за будаўніцтва палаца. Ёсць верагоднасць, што ў Смілавічах ён пабудаваў з выкарыстаннем старых сцен палаца М. К. Агінскага новы двухпавярховы, у формах псеўдаготыкі, прамавугольны ў плане палац з двухскатным дахам. З боку галоўнага фасада палац мае масіўную прыбудову ў выглядзе трохпавярховай вежы, упрыгожанай наверсе зубцамі кшталту старажытных абарончых збудаванняў.

Казімір Манюшка заклаў батанічны сад, а яго спадчыннік Аляксандр пачаў узводзіць новы палац, які прымыкаў да першага. Гэта быў прамавугольны, двухпавярховы будынак з эркерамі ў стылі неаготыкі з элементамі мадэрну. Пасля завяршэння пабудовы ў 1900 г. палацы Манюшкаў зліліся і атрымалі выгляд аднаго вельмі рэпрэзентацыйнага будынку. У ім стары палац выконваў ролю бальнай залы з більярднай і гасцёўнямі, а ў новым размясціўся збор карцін, кніг, старажытных рукапісаў, а таксама архівы Агінскіх, Манюшкаў і Ваньковічаў.

Станіслаў і Ева Манюшкі мелі дзесяць дзяцей. Усе яны атрымалі добрую адукацыю і спадчыну. Сыну Чаславу адышоў маёнтак Убель. Тут у 1819 г. нарадзіўся будучы славуты кампазітар Станіслаў Манюшка.

У васьмі кіламетрах ад Смілавіч знаходзіўся маёнтак Дукора. Пасля Агінскага Дукорай стаў валодаць сябар і сваяк Манюшкаў — Францішак Оштарп. Яго сын Леан стаў маршалкам шляхты Мінскай губерніі. Яго вялізны двор быў заўсёды поўны гасцей. Акрамя вядомага на ўсю акругу аркестра, тут існавалі цырк, тэатр, вялікая бібліятэка, карцінная галерэя, конезавод.






Карта-схема з кнігі Анатоля Федарука



Напалеон Орда
**«Касцёл Святога Вінцэнта**
**і кляштар місіянераў у Смілавічах»**
1870-я гг.





Фота Сяргея Плыткевіча





Фота Максіма Тарналіцкага





Напалеон Орда
**«Дукора»**
1876 г.

# Беніца

## (Маладзечанскі раён, Мінская вобласць)

На Маладзечаншчыне захавалася яшчэ адна таямніца роду Агінскіх. У 1738 г. Казімір Ігнат Агінскі разам з жонкай Разаліяй Коцел передае ва ўласнасць свайму брату Тадэвушу Францішку маёнтак Ганута і Маладзечна з фальваркамі. Князь Тадэвуш Францішак Агінскі (1712–1783) у 1757 г. пачынае ў Маладзечне будаўніцтва парафіяльнага касцёла і кляштара трынітарыяў. У гэты час ён жыве ў адрэстаўраваным палацы князёў Збаражскіх, размешчаным на Маладзечанскім замчышчы. 7 лістапада 1761 г. памірае жонка князя Тадэвуша Агінскага, 15 лютага яе пахавалі ў новым касцёле. Па ўсім відаць, што княгіню праз тры месяцы перапахавалі, хаця рэлігійнымі канонамі гэта не віталася. Разгадка крыецца ў наступным: магнаты і князі стваралі культавыя збудаванні яшчэ і як месца родавых пахаванняў. Князь Мікалай Радзівіл (Сіротка), вандруючы па свеце, прывёз з Егіпта рэцэпт бальзаму, які выкарыстоўвалі для муміфікацыі цел фараонаў. Тады і абрад пахавання ў скляпы (а не ў зямлю) становіцца культавым для найбагацейшай эліты ВКЛ. Так, у 1701 г. пры фінансаванні кашталяна трокскага, скарбніка ВКЛ Міхала Казіміра Коцела (яго род валодаў Беніцай, Маладзечнам і навакольнымі землямі з 1634 г.) пачынаецца ўзвядзенне ў Беніцы касцёла Найсвяцейшай Троіцы і кляштара бернардынцаў. Касцёл уяўляў сабой манументальную крыжова-купальную пабудову з двухвежавым галоўным фасадам. Касцёл і брама пабудаваныя ў стылі барока. Святыня захавалася і сёння, з'яўляецца помнікам гісторыі і культуры. На ўваходзе знаходзіліся трохступеньчатыя надмагіллі (помнікі), а ў самім касцёле — сямейны склеп Коцелаў і Швыкоўскіх. Высечаныя з каменю грабніцы з каменнымі надмагільнымі плітамі размяшчаліся (і цяпер таксама) на глыбіні 2,5–3 м. Пэўная тэмпература і вільготнасць стваралі ўмовы для працяглага захоўвання целаў памерлых (нягледзячы на тое, што Троіцкі касцёл у Беніцы зараз знаходзіцца пад аховай дзяржавы, у ім адбыліся акты вандалізму і марадзёрства). Беніцкі касцёл па сваіх акустычных уласцівасцях не ўступае індыйскім храмам, у ім гучаў арган, выраблены італьянскімі майстрамі.

У 1851 г. кляштар быў ліквідаваны. Перыяд заняпаду касцёла пачаўся, калі расійскія ўлады ў 1866 г. перарабілі яго ў царкву і закрылі манастыр. У 1919-м яго вярнулі каталікам, якіх цяпер у вёсцы зусім мала. Пасля Вялікай Айчыннай вайны храм закрылі, размясцілі ў ім калгасны склад. У канцы 1980-х гг. тут распачыналі рэстаўрацыйныя работы, але да канца іх не давялі.

Мясцовыя жыхары сцвярджалі, што ў Беніцкім касцёле хрысціў сваіх дзяцей Міхал

Клеафас Агінскі. Быццам бы гэта было запісана ў дамавой кнізе Коцелаў, якая раней захоўвалася ў школе. Дайшла да нашых дзён і легенда пра тое, што праз Беніцу пралёг шлях Напалеона і Кутузава, гэта было засведчана на дошцы на сцяне касцёла. У яго сутарэнні знайшлі астанкі 30 маладых мужчын, па меркаванні, французскіх салдат 1812 г.

З касцёла вёў падземны ход да панскага маёнтка, што знаходзіўся метраў за трыста (цяпер на яго месцы стаіць ферма). Старажылы расказвалі, што Коцел пад уваходам у касцёл закапаў скарб для будучай рэстаўрацыі святыні. Спачатку яго хацелі здабыць прыезджыя з Масквы, але адмовіліся: калі паспрабавалі падняць пліту, па сцяне касцёла да самага верху пайшла трэшчына. Праз некаторы час мясцовыя жыхары зрабілі падкоп і дабраліся да скарбу. Але каштоўнасці не прынеслі ім шчасця, мужчыны заўчасна пайшлі з жыцця.










Галіна Бяганская
**«Касцёл у в. Беніцы»**
Папера, акварэль. 57х41. 2019 г.

# Бялынічы

## (Магілёўская вобласць)

У 1696 г. Бялынічы атрымаў у заклад ад Ізабэлы Хадкевіч Казімір Дамінік Агінскі (?–1773), з 1733 г. імі валодае Марцыян Міхал Агінскі, які ўжо ў 1742 г. уступае Бялынічы сыну Ігнацыю і яго знакамітай жонцы Алене (разумнай, прыгожай і магутнай сілы жанчыне з роду Агінскіх, якая пражыла 90 год). Спадчыннае ж права на выкуп Бялыніч з закладу (за 100 тыс. злотых) здаўна мелі Радзівілы. І вось праз 70 год гетман Вялікага Княства Літоўскага Міхал Казімір Радзівіл Рыбанька вырашыў гэтым правам скарыстацца. Ён нават сабраў 106 тыс. злотых старой срэбнай манетай, каб пазбегнуць абвінавачвання ў абясцэньванні сучасных грошай. Але Агінскія ўсяляк зацягвалі справу. І нават калі суд прызнаў усе правы на Бялынічы за Радзівіламі, аканом Агінскіх папросту не пусціў судовага выканаўцу ў маёнтак. Барацьбу працягваў пасля смерці бацькі ўжо Караль Станіслаў Радзівіл Пане Каханку, але тут адбыўся першы падзел Рэчы Паспалітай. Радзівілы адмовіліся прынесці прысягу Кацярыне II і былі пазбаўлены ўсіх усходнебеларускіх зямель. Агінскія ж, наадварот, мелі добрыя сувязі пры царскім двары яшчэ з часоў Анны Іаанаўны. Такім чынам, Бялынічы засталіся за імі, хаця і былі падзелены мяжой на дзве часткі. Пасля смерці мужа Алена падаравала Бялынічы яго пляменніку — маладзечанскаму графу Францішку Ксаверыю (1742–1814). А пасля яго смерці спадчыннікам стаў Міхал Клеафас Агінскі (1765–1833). У 1740-х гг. Ігнацый і Алена Агінскія будуюць тут новы палац побач са старым і закладаюць ліпавы сад, які даў пачатак парку. Палац уяўляў сабой двухпавярховы дом на каменным падмурку, абнесены каменнай агароджай. Ён не захаваўся, таму што быў разбураны падчас Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Дарэчы, у 1624 г. Леў Сапега заснаваў у Бялынічах кляштар кармелітаў. Ікону Маці Божай ён, магчыма, вывез з Маскоўскага княства ў часы Смуты, але дакладнае яе паходжанне невядома. Падчас Руска-польскай вайны 1654–1667 гг. ікона была эвакуіравана ў Ляхавічы. У 1742 г. кляштар згарэў. Агінскія пабудавалі новы — мураваны, з вялікім касцёлам, у ім умяшчалася да 3 тыс. чалавек, з Ляхавіч была вернута цудадзейная ікона, што абставілі з вялікай пышнасцю. Па замове Агінскіх, згодна з булай Папы Рымскага, абраз атрымаў карону з каштоўнымі камянямі. У Бялынічы пачалося масавае паломніцтва ўніятаў, каталікоў і праваслаўных. Абраз бясследна знік з Магілёўскага сховішча разам з крыжам Еўфрасінні Полацкай і іншымі скарбамі летам 1941 г. Касцёл быў зруйнаваны ў 1960-я гг. падчас дзяржаўнай кампаніі па барацьбе

з рэлігійнымі забабонамі. Прысядзібны парк Агінскіх існуе дагэтуль і носіць назву «Ліпавы гай», з'яўляючыся помнікам садова-паркавага мастацтва. У цэнтры яго захаваўся відавы пагорак і невялікі вадаём. У савецкія часы ў парку зроблена мемарыяльная алея Герояў Савецкага Саюза і брацкая магіла партызан і савецкіх воінаў, якія загінулі ў 1941–1944 гг.



Маці Божая Бялыніцкая







Напалеон Орда
**«Бялынічы (Магілёўская губернія).**
**Мястэчка над Друццю»**




Парк «Ліпавы гай»,
г. Бялынічы






Мемарыял воінам, якія загінулі ў 1941–1944 гг., на месцы парка Агінскіх

# Віцебск

Першы вядомы віцебскі Агінскі — Леў Самуэль (каля 1595–1657), стольнік трокскі. Яго дом знаходзіўся на тэрыторыі Дольнага замка. Леў Самуэль разам з браслаўскім суддзёй С. Мірскім аднавілі заняпалы Маркаў манастыр і адпісалі манахам маёнткі Маркава і Шыдлоўшчыну.

Сярод пабудоў Верхняга замка на левым беразе ракі Віцьбы з сярэдзіны XVII па сярэдзіну XIX ст. знаходзіўся так званы палац Агінскіх. Ён быў узведзены ў стылі рэнесанс і з'яўляўся адным з найбуйнейшых мураваных будынкаў горада. Досыць падрабязная выява палаца змешчана на «Чарцяжы горада Віцебска 1664 г.», выкананым для маскоўскага цара Аляксея Міхайлавіча пасля захопу горада рускімі войскамі. У палацы ў гэты час размяшчалася базыльянская школа.

Палац меў складаную асіметрычную кампазіцыю, двухпавярховы і прамавугольны ў плане, завяршаўся двухсхільным дахам са ступенчатым шчытом. З аднаго боку да яго прымыкала высокая гранёная вежа, якая завяршалася складаным купалам, а з другога — невялікая прыбудова, накрытая двухсхільным дахам, з галерэяй і разной балюстрадай. Галоўны ўваход уяўляў сабой васьміграннны данжон з шатровым пакрыццём і цыбулькай-макаўкай. На другі паверх вяла парадная вонкавая лесвіца.

Гісторыя пабудовы палаца невядомая. У ім па чарзе пражывалі падкаморы віцебскі Шыман (Сымон) Караль Агінскі (1620–1699) і ваявода віцебскі Марцыян Міхал Агінскі (1672–1750). Шыман Агінскі, нягледзячы на пераход у каталіцтва, працягваў падтрымліваць праваслаўны Маркаў манастыр. Пасля пажару 1690 г. ён за свае сродкі аднавіў манаскія келлі і пабудаваў драўляную царкву Св. Тройцы з выявай герба роду Агінскіх на дзвярах.

Марцыян Міхал Агінскі, сын Шымана Караля і Тэадоры з Корсакаў, стаў віцебскім кашталянам у 1703 г., а ў 1730 г. — віцебскім ваяводам (кіраўніком мясцовай адміністрацыі). Большасць яго маёнткаў знаходзілася вакол Віцебска: Мікуліна, Лёзна, Марцыянава, Веляшковічы, Горспля, Усвяцкае і Бабінавіцкае староствы, Бобр і Бялынічы. Падчас Паўночнай вайны 1700–1721 гг. горад пацярпеў ад рабункаў і вымаганняў з-за перамяшчэнняў войск, дамы і маёмасць многіх жыхароў былі знішчаны пажарамі. У сувязі з гэтым Агінскі прасіў вялікага літоўскага польнага гетмана Міхала Сярвецыя Вішнявецкага ўзяць Віцебск пад апеку і вылучыць грошы на адбудову. Пазней дабіваўся перад Літоўскім Трыбуналам, каб Віцебск і прыналежныя да яго фальваркі былі

вызвалены ад усялякага роду патрабаванняў з боку войска.

Марцыян Міхал Агінскі праявіў сябе як мецэнат і шчодры фундатар касцёлаў і кляштараў у Вільні, Віцебску і Мікуліне. Вядома, што ў Віцебску на яго сродкі быў пабудаваны езуіцкі касцёл у гонар Св. Юзафа, а віцебскаму дамініканскаму кляштару ахвяраваў 2 тыс. талераў і апякаў віцебскі езуіцкі калегіум. Пры двары Агінскага дзейнічала інструментальная капэла, якая іграла на гарадскіх і сямейных урачыстасцях.

Міхал Марцыян хацеў зрабіць у крыпце езуіцкага касцёла сямейны склеп. Тут пахаваны дзве яго жонкі, сам віцебскі ваявода, яго сын Ігнацый са сваёй жонкай Аленай. У XIX ст. касцёл быў перабудаваны ў праваслаўны храм, а ў 1957 г. узарваны.



Палац Агінскіх на чарцяжы г. Віцебска 1664 г.



Дзмітрый Струкаў
**«Маркаў манастыр, які фундавалі Агінскія»**
1864 г.





Свята-Троіцкі Маркаў мужчынскі манастыр. Сучасны выгляд

# Ганута
## (Вілейскі раён, Мінская вобласць)

Лясісты маёнтак Ганута, размешчаны на мяжы былых Ашмянскага і Завілейскага паветаў, ля месца ўпадзення ракі Нарачанкі ў Вілію, да 1723 г. належаў старасце Маркаўскаму, магнату Казіміру Коцелу. Яго дачка Разалія была замужам за бяздзетным Казімірам Ігнаціем Агінскім (?–1769), старастам Пшавальскім і Бабінавіцкім. У 1738 г. Казімір і Разалія Агінскія запісалі Гануту і Маладзечна разам з фальваркавымі землямі і прыгоннымі сялянамі Тадэвушу Агінскаму (1712–1783), роднаму брату Казіміра, будучаму ваяводзе трокскаму і маршалку Сената.

Тадэвуш Агінскі, які жыў у Тадуліне пад Віцебскам, а потым у Маладзечанскім замку, у 1765 г. пабудаваў у Ганууце палац, які захаваўся да 1943 г. Нягледзячы на яго надзвычай цікавую і элегантную архітэктуру, гэты палац у свой час быў малавядомы, бо размяшчаўся далёка ад галоўных трактаў, сярод лясоў. Аўтар праекта — віленскі архітэктар Ян (Іаган) Вільгельм Фрэзер, вучань Глаўбіца. Даследчыкі і гісторыкі аднадушна адзначалі высокія мастацка-архітэктурныя вартасці будынка. Палац Тадэвуша Агінскага выглядаў амаль аднолькава як з фронту, так і з тылу, дзе знаходзіўся фруктовы сад. Розніца назіралася толькі ў бакавых частках, дзе з аднаго боку да сцяны быў прыроблены арыгінальны вадзяны фантанчык, у якім вада выцякала з пашчы каменнага льва. Усярэдзіне размяшчаліся зала і прыгожы хол, аздоблены стылёва аформленай лесвіцай і балконам, на якім у час правядзення асамблей і баляў іграў аркестр. Сведчаннем вялікай увагі, якая надавалася найдрабнейшым архітэктурным элементам пры будаўніцтве ганупкай рэзідэнцыі, з'яўляецца тое, што на ўездзе па абодва бакі дарогі былі ўстаноўлены мадэляваныя калоны, каб адгароджваць пад'язную дарогу ад газону. Балюстрада, якая акружала тэрасу, таксама была





вытрымана ў аднолькавым стылі з калонамі. Перад галоўным уваходам знаходзілася вялікая тэраса, яна адначасова служыла пад'ездам. Упрыгожвалі маёнтак дзве каплічкі: перад уваходам у палац і на могілках. Адна з іх захавалася да нашых дзён.

Менавіта ў гэтай рэзідэнцыі Тадэвуш Агінскі правёў апошнія гады свайго жыцця. Адсюль вёў перапіску з каралём Станіславам Аўгустам Панятоўскім і дзякаваў яму за прызначэнне сына Анджэя ваяводам трокскім. Тут ён і памёр у 1783 г. Пахаваны ў капліцы Агінскіх ва ўніверсітэцкім касцёле Св. Яна ў Вільні. Пасля смерці Тадэвуша Ганута і Маладзечна перайшлі да яго малодшага сына Францішка Ксаверыя Агінскага (1742–1814), апошняга літоўскага кухмістра, а ад яго па спадчыне да пляменніка Міхала Клеафаса Агінскага (1765–1833). Пасля падзелу маёмасці, які адбыўся ў 1832 г., уладальніцай Гануты стала родная сястра Міхала Клеафаса — Юзэфа. Яна ў хуткім часе перадала гэтыя землі сям'і Жэвускіх. Апошнім прыватным уладальнікам Гануты быў памешчык Ежы Валовіч, які памёр каля 1941 г.







Напалеон Орда
**«Палац Агінскіх у в. Ручыцы (Вілейскі раён Мінскай вобласці)»**
1875–1877 гг.





К. Мінтэр
**«Партрэт
Тадэвуша Францішка Агінскага»**
1826 г.



Эдуард Мацюшонак
**«Гукі паланэзу»**
Палатно, алей. 60х76. 1999 г.



# Гродна

Існуе шмат архіўных звестак пра ўладанні Агінскіх у Гродне. Розныя прадстаўнікі роду валодалі часткамі зямлі ў горадзе яшчэ з сярэдзіны XVII ст., напрыклад, захаваліся звесткі, што ваўкавыскі маршалак Мікалай Францішак Агінскі ў 1664 г. набыў тут надзел зямлі (вуліца Віленская).

Дакладна вядома пра два палацы Агінскіх. Палац Міхала Казіміра Агінскага знаходзіўся на месцы сквера насупраць сучаснай вуліцы Свярдлова (раней скрыжаванне Сеннай, Татарскай вуліц і Рыначнай плошчы). Пабудаваны ў 1790 г. архітэктарам К. Шыльдгаўзам у стылі класіцызму з элементамі народнага дойлідства. Двухпавярховы, прамавугольны ў плане будынак з развітымі рызалітамі ў цэнтры галоўнага і дваровага фасадаў. У мураваным першым паверсе знаходзіліся каморы і парадная двухмаршавая лесвіца. Драўляны другі паверх уключаў жылыя пакоі, залы, кухні. Прыкладна ў сярэдзіне XIX ст. будынак быў перабудаваны ў цалкам мураваны. Асноўны аб'ём накрыты высокім чатырохсхільным дахам. Фасады дома мелі чатырох'яруснае вырашэнне. Ніжні ярус (першы паверх) быў масіўны, з невялікімі гладкімі прамавугольнымі аконнымі праёмамі, верхні — больш высокі, ажурны, прарэзаны рытмічным радам шырокіх акон з ліштвамі. Рызаліт на фасадзе быў завершаны невялікім атыкам, галоўны ўваход аформлены стылізаваным порцікам. Ад Міхала Казіміра ў 1792 г. уся нерухомасць паводле дамоўленасці перайшла да вялікага літоўскага падскарбія Міхала Клеафаса Агінскага (1765–1833). Да яе належалі двухпавярховы палац, афіцыны і канюшні. Маёмасць гэта была канфіскавана пасля паўстання 1794 г. У гады Першай сусветнай вайны палац цалкам разбураны.

Другі палац (сёння — вул. Завадская, 2) пабудаваны ў канцы XVII ст., перабудаваны ў 1877 г. Галоўнай дамінантай гэтага гарадскога раёна лічыўся палац Сапегаў. Як сведчаць матэрыялы архіва гэтага роду, у 1530 г. кароль Жыгімонт пацвердзіў віцебскаму ваяводу Івану Сапегу набыццё нерухомай маёмасці, у прыватнасці «палацаў над Нёманам» у Гродне. З 1555 г. паходзіць згадка аб тым, што Астафій Валовіч, які «мел дворец Сапеженьский […] на сей стороне Немана от места Городенского», абмяняў гэтую нерухомасць на палац войта Пятра Шаматулы. Сучасны будынак мог часткова існаваць ужо ў 1680-я гг. як палац князёў Сапегаў. Напэўна, упершыню гэты аб'ект згадваецца ў якасці гістарычнага помніка Ю. Ядкоўскім, які ў сваім путэводніку па Гродне называе яго «палацам князёў Сапегаў», які «цяпер з'яўляецца піўзаводам Марголіса». У графічных крыніцах

дадзены аб'ект упершыню адзначаецца на гэтак званай «стакгольмскай» карце Гродна 1655 г., на якой ён мае прамавугольную форму з чатырма вежачкамі па вуглах. Паводле плана Гродна 1706 г., палац належаў троцкаму ваяводу Юзафу Агінскаму. Згодна так званаму «дрэздэнскаму» плану Гродна 1753 г., на будынку засталіся толькі дзве вежы з боку Нёмана. Звесткі 50–70-х гг. XVIII ст. сведчаць аб тым, што палацам з афіцынамі валодаў польны літоўскі пісар, будучы гетман вялікі літоўскі Міхал Казімір Агінскі. У тарыфе падымнага падатку Гродна 1775 г. пры апісанні вуліцы Садоўніцкай адзначаны «палац мураваны» вялікага літоўскага гетмана Агінскага. У 1779 г. пасэсію за 35 тыс. злотых набылі гродзенскі маршалак Казімір і Ганна з Хлявінскіх Вольмеры, а ў 1789 г. нерухомасць перайшла да літоўскага канцлера Аляксандра Сапегі. У 1801 г. яе ўладальнікам стаў граф Міхал Дзяконскі. Пачынаючы з 1812 г., будынак належаў розным купцам, у ім знаходзіліся складскія і жылыя памяшканні. Паміж 1830 і 1860 гг. будынак страціў бакавыя вежачкі. Да нашых дзён у пабудове захаваліся рэшткі пілястраў з характэрнымі для стылю барока элементамі.

Пачынаючы з 1870-х гг., нерухомасць належала піўвару Юзафу Кунцу (1830–1903), аўстрыйскаму падданаму. У будынках былі размешчаны бровар і саладоўні, у 1877 г. пачаў функцыянаваць піўзавод, які спыніў сваё існаванне толькі ў 2007 г.



Палац Міхала Казіміра Агінскага ля Сяннога рынка ў Гродне


Палац Сапегаў-Агінскіх



Сучасны выгляд палаца Сапегаў-Агінскіх. Фота Сяргея Плыткевіча

# Дрысвяты і Пошча
## (Браслаўскі раён, Віцебская вобласць)

Род Агінскіх даволі працяглы час звязаны з Браслаўшчынай, і яго ўладанні ў розных кутках рэгіёна былі вельмі значныя. Яшчэ калі продкі Агінскіх зваліся Глазынамі, адзін з іх — князь Алёхна Глазына — у 1500 г. атрымаў ад вялікага князя Аляксандра двор Опса ў Браслаўскім павеце.

М. К. Агінскі з 1790-га па 1794 г. валодаў Дрысвятамі. Ён набыў іх у Караля Станіслава і Гераніма Радзівілаў узамен на абяцанне разлічыцца з велізарнымі даўгамі апошніх (3 453 тыс. злотых). Дрысвяцкі ключ прыносіў добры прыбытак (у 1790 г. — 76 326 тыс. злотых), але ж і расходы магнатаў былі надта вялікія. Агінскаму, па меркаванні даследчыка Анджэя Цэханавецкага, трэба было «праз набыццё маёмасці… дасягнуць матэрыяльных асноў, якія адпавядалі б яго пасадзе» — мечніка літоўскага, надзвычайнага пасла Рэчы Паспалітай, а потым і вялікага падскарбія літоўскага.

У часы М. К. Агінскага Дрысвяцкі двор быў ужо перанесены з вострава на возера Дрысвяты, на бераг азёрнага заліва побач з вусцем ракі Рычанкі. Тэрыторыя двара складалася з параднай і гаспадарчай частак, раздзеленых уязной алеяй. Увесь двор і асобныя часткі яго былі абнесены агароджай з астраколу і бярвення. На ўездзе была брама з падвойнымі варотамі. Побач з брамай быў стары фальваркавы дом, а далей — новы дом «для панскай рэзідэнцыі».

У сакавіку 1794 г. Агінскі прадаў Дрысвяты за 2 100 тыс. злотых свайму швагру (мужу роднай сястры Юзэфы) Яну Нікадзіму Лапацінскаму. Падчас паўстання Касцюшкі атрад Агінскага зрабіў рэйд на Дынабург (сучасны Даўгаўпілс), але шлях яго пралёг толькі па літоўскай частцы Браслаўскага павета. Лапацінскія валодалі Дрысвятамі да паўстання 1863 г. Тут яны бывалі часта і мелі сталае жытло.

Да нашага часу ад маёнтка захаваліся некалькі будынкаў, а таксама частка парку, якая дае ўяўленне аб першапачатковай структуры маёнтка. Але найбольш значным маёнткам Агінскіх на Браслаўшчыне была Пошча, якая ўключала ў свой склад вёскі, прылеглыя да возера Пагошча (Пагошча, Рымуці, Вярнэлі, Зуселле, Залессе з трыма засценкамі), і само возера. Зразумела толькі, што маёнтак быў вялікі. Нездарма ж увесь кароткі тэрмін існавання Браслаўскага ваяводства (1793–1795 гг.) Міхал Клеафас Агінскі быў яго нязменным кашталянам.




Дрысвяты на карце XVIII ст.

# Лучай
## (Пастаўскі раён, Віцебская вобласць)

Эльжбэта Магдалена Агінская (у другім шлюбе Пузына) з мужам Антоніем Пузынам набылі Лучай у 1731 г. і хутка пабудавалі тут палац і разбілі парк. Дарэчы, Пузыны — гэта адно з адгалінаванняў роду Агінскіх, прадстаўнікі якога таксама карысталіся гербам «Агінец».

Эльжбэта Пузына была адукаванай жанчынай, цікавілася развіццём навукі. Пры ёй у Лучаі праводзіліся астранамічныя назіранні з адмысловай вежы. Дапамагала абсерваторыі Віленскай езуіцкай акадэміі (будучага ўніверсітэта): закупіла астранамічныя прыборы ў Англіі; штогод пералічвала па шэсць тыс. злотых на патрэбы навучальнай установы. У Лучаі яна таксама заснавала дом для місіі езуітаў і ахвяравала 160 тыс. злотых на выдаткі ордэна.

Антоній Пузына памёр у 1752 г., а Эльжбэта, не маючы дзяцей, яшчэ за 12 год да смерці адпісала Лучай траюраднаму брату Тадэвушу Агінскаму, які і пабудаваў тут у 1766 г. касцёл Св. Тадэвуша. Ён быў узведзены ў стылі позняга барока, але ў пачатку XIX ст. часткова перабудаваны ў формах класіцызму і аздоблены роспісам. Касцёл уяўляе сабой двухвежавую трохнефную базіліку з паўцыркульнай апсідай і трансептам. Размаляваны ў стылі грызайль. За ім знаходзіцца парк, у цэнтры якога стаяў велічны палац з упрыгожанымі мармуровымі скульптурамі. Разбураны ў Другую сусветную вайну.



Палац Агінскіх. Здымак пачатку XIX ст.





Касцёл Святога Тадэвуша.
Фота Мечыслава Тарасевіча.
2021 г.



Фота
Аляксандра Дзехцяронка



Фота
Галіны Рачко





# Слонім

## (Гродзенская вобласць)

Слонімскую эканомію (маёнтак) вялікі гетман літоўскі Міхал Казімір Агінскі (1729–1800) атрымаў у якасці пасагу за жонкай Аляксандрай з роду Чартарыйскіх. Пабудаваў тут некалькі прадпрыемстваў, друкарню, праклаў шэраг брукаваных гасцінцаў і канал, што злучыў рэкі басейнаў Дняпра і Нёмана. Заснаваў оперны тэатр, музычную капэлу, адкрыў агульнаадукацыйныя школы. Праславіўся як аўтар музыкі да опер, песень, стваральнік вершаў, аповесцей, баек.

На Опернай вуліцы ў Слоніме знаходзіўся тэатр Агінскага. На вялікі жаль, будынак не захаваўся. Але ёсць Оперная вуліца — назвы такой не мае ніводзін горад у свеце. А вось аўстэрыя, пабудаваная з цэглы архітэктарам Я. Боем, які спраектаваў пры палацы Агінскага шэраг барочных надворных пабудоў, дайшла да нашага часу. Аўстэрыя — адзіная ацалелая пабудова аднаго з найцікавейшых палацавых ансамбляў Беларусі другой паловы XVIII ст. Яна сёння дае ўяўленне аб агульным характары яго барочнай архітэктуры. Сапраўды, з дзейнасцю Міхала Казіміра Агінскага быў звязаны росквіт Слоніма ў другой палове XVIII ст. У ноч на 23 верасня 1771 г. яго трохтысячнае войска было разбіта пад Сталавічамі (цяпер Баранавіцкі раён) рускімі войскамі Суворава. Пасля паражэння Міхал Казімір Агінскі эмігрыраваў. Але праз чатыры гады, атрымаўшы амністыю і секвестраваныя маёнткі, вярнуўся ў Слонім. Па яго ініцыятыве і на ўласныя сродкі быў пабудаваны канал Агінскага.

Слонім часоў Агінскага нярэдка называлі «Палескімі Афінамі». Сюды ў святочныя дні з’язджаліся вяльможы і найбагацейшая шляхта з усяго краю і нават з Варшавы. Горад меў узорны парадак: скверы, сады, аранжарэі ды рыбныя ставы ствараліся і дагледаліся лепшымі спецыялістамі Еўропы. У 1768 г. вялікі гетман літоўскі, князь М. К. Агінскі на месцы старога замка Сапегаў пабудаваў новы мураваны палац (архітэктары І. Мараіна, Я. Бой). У комплексе з палацам у другой палове XVIII ст. узведзены таксама друкарня, тэатр, будынкі для прыдворных, манеж, аранжарэя, гаспадарчыя пабудовы. Важным мерапрыемствам стала будаўніцтва канала Агінскага, які вырауняў рукаў Шчары і ўвайшоў у ландшафтную кампазіцыю перад палацам. Была створана прыстань, якая ўключыла два адгалінаванні канала для прычальвання лодак. Палац прасторава злучаўся з каналам. Як і ў Гродне, нерэгулярная прасторава-планіровачная структура, якая свабодна фарміравалася на працягу стагоддзяў, захавалася да нашага часу ў Слоніме. Першаасновай горада служыў невялікі па тэрыторыі замак, дзе сыходзіліся вуліцы.

Рэльеф мясцовасці, адсутнасць вонкавага пояса ўмацаванняў, асаблівасці трасіроўкі гандлёвых шляхоў у сукупнасці з іншымі фактарамі абумовілі складаныя абрысы вулічнай сеткі.

Вялікая тэатральная трупа вялікага гетмана літоўскага Міхала Казіміра Агінскага ў Слоніме была заснавана каля 1771 г., а спыніла сваю дзейнасць пасля 1791 г. У тэатры Агінскага працавалі прафесійныя італьянскія, нямецкія, польскія спевакі, мясцовы беларускі хор і балет. Паводле «Інвентара інструментаў і музычных папер», складзенага ў 1801 г., збор нот твораў, што выконваліся на розных сцэнах тэатра Агінскага, уключаў 60 опер, 18 балетаў, тры музычныя камедыі, 253 сімфоніі і больш за 460 іншых музычных твораў (араторыі, арыі, музыка для дывертысментаў, асобныя танцы і інш.). Паміж 1777–1780 гг. у Слоніме быў пабудаваны «Дом оперы» (архітэктар Іначэнца Мараіна), разбураны пасля 1804 г. Ён меў вялікую сцэну, прыстасаваную для паказаў любых барочных спектакляў, опер і балетаў, для выхаду вялікай колькасці спевакоў і статыстаў, для тэатральных баталій коннікаў і водных феерый (частка сцэны затаплялася вадой з канала Агінскага, і па ёй плавалі лодкі), для складаных перспектыў і дэкарацый, розных сцэнічных эфектаў. Тэхнічныя магчымасці сцэны дазвалялі паказаць і два фантаны, якія асвятляліся бенгальскімі агнямі.

Пасля другога раздзелу Рэчы Паспалітай 1793 г. Слонім як рэзідэнцыя гетмана згубіў сваё значэнне. Горад патрабаваў вялікіх затрат і размяшчаўся ўбаку ад асноўных шляхоў. Сам Агінскі асеў у Галенаве пад Варшавай. Слонім тым часам перайшоў у рукі арандатараў і хутка прыйшоў у заняпад. Ужо ў 1804 г. тэатр быў развалены, а праз 80 гадоў ад «Палескіх Афін» не засталося нават і руін.



Тэатр Агінскага ў Слоніме. Рэканструкцыя Васіля Грыневіча



Рэшткі палаца Агінскага, разабраныя ў 1940-я гг.



Дом, пабудаваны Агінскім. Здымак 1930-х гг.



Рака Шчара. Бульвар Агінскага. Здымак 1930-х гг.




Слонімскі драматычны тэатр




МІХАЛ
КАЗІМІР
АГІНСКІ
1728 - 1800
ГЕТМАН ВЯЛІКАГА КНЯСТВА
ЛІТОЎСКАГА, МЕЦЭНАТ,
КАМПАЗІТАР, ЗАСНАВАЛЬНІК
ТРАДЫЦЫЙ ТЭАТРАЛЬНАГА
МАСТАЦТВА Ў СЛОНІМЕ.

# Сянно
## (Віцебская вобласць)

Сянно атрымаў Тадэвуш Францішак Агінскі (1712–1783) у пасаг за другой жонкай Ядвігай з роду Залускіх. Разам яны распачалі будаўніцтва касцёла Св. Тройцы (1768–1772 гг.). Пасля ўзвядзення ў касцёл былі прывезены з Рыма рэліквіі Св. Фартуната. Асвячэнне храма і ўводзіны мошчаў святога праходзілі як вялікая трохдзённая ўрачыстасць, у якой удзельнічалі больш за 100 манахаў францысканцаў з усяго Вялікага Княства Літоўскага і шмат свецкіх гасцей. Паміж палацам Агінскіх і касцёлам стаялі тры трыумфальныя брамы, пры якіх францысканскія прафесары чыталі эгзорты (літаральна «ўваход на гару») у гонар Св. Фартуната. Мошчы неслі пад гукі харавой капэлы, спевы манахаў і гарматныя стрэлы.

Сенненскі касцёл уяўляў сабой рэдкі па прыгажосці будынак, адзін з лепшых прыкладаў



Сенны рынак.
Палац Агінскіх. 1903 г.

позняга барока не толькі ў Беларусі, але і ва ўсёй Еўропе. Ён стаяў у вельмі прыгожым месцы — на высокай гары над возерам. Перш за ўсё звяртаў на сябе ўвагу арыгінальны галоўны фасад на тры ярусы, велічны вобраз якога ў значнай ступені быў ажыўлены гульнёй святла, што стваралася складанымі профілямі карнізаў і паглыбленняў. Уражанне ўзмацнялася роспісам купала, фігурамі анёлаў на слупах, скульптурай у алтарах. Архітэктар — Ян (Іаган) Вільгельм Фрэзер (?–1772) сын вядомага віленскага рэзчыка Яна Караля Фрэзера, аўтар палаца ў Гануце.

Кляштар францысканцаў у Сянно існаваў з 1609 г. Новы мураваны будынак паўстаў у 1760 г. (па іншых звестках у 1809 г.). Пры кляштары была першая ў Сянно школа. Кляштар і касцёл былі забраны ў францысканцаў у 1845 г., будынак кляштара стаў плябаніяй. За гады ваяўнічага атэізму ён памяняў шмат гаспадароў, зараз у ім месціцца каўбасны цэх.

У той час касцёлу не пашанцавала: быў зачынены ў 1921 г. пасля смерці ксяндза А. Астрамовіча — вядомага як паэт Андрэй Зязюля. Ён пісаў вершы і вёў службу па-беларуску, супрацоўнічаў з газетай «Наша Ніва», быў добра знаёмы з Янкам Купалам і Якубам Коласам.

Касцёл быў узарваны ў 1962 г.







Фота Аляксандра Хітрова



Касцёл Святой Тройцы

# Тадулін

## (Віцебскі раён, Віцебская вобласць)

Маёнтак пачынаўся з вёскі Вымна на беразе аднайменнага возера. Вымна вядома з 1552 г. як уладанне Кісялёў, потым князёў Лукомскіх, Саковічаў. У 1692 г. Марцыян Міхал Агінскі купіў у Лукомскага 28 дамоў у Вымне і два дамы ў суседняй Слабадзе. У 1745 г. ён ажаніўся (чацвёрты раз) з Тэкляй Саковіч і атрымаў Вымна ў пасаг. Апошнюю частку маёнтка набыў у Саковіча Тадэвуш Францішак Агінскі ў 1775 г. Тут ён зрабіў сваю першую рэзідэнцыю, якую назваў уласным імем. У віхурах часу рэзідэнцыя не ацалела, таму сёння невядома нават дакладнае месца, на якім яна стаяла.

У Тадуліне ў 1740 г. нарадзіўся старэйшы сын Тадэвуша Агінскага ад першага шлюбу (з княжной Ізабэлай Радзівіл) — Анджэй, бацька Міхала Клеафаса Агінскага. У гэтым жа годзе Тадэвуш Агінскі даў фундуш базыльянам на царкву і фальварак. Верагодна, архітэктарам гэтай царквы быў Ян Фрэзер. Базыльянскі манастыр стаяў на ўзгорку ля возера. Будынкі манастыра зніклі ў 1940–1950 гг. Але і зараз гэтая мясціна выглядае прыгожа. У кляштары знаходзіўся цудадзейны абраз Маці Божай Тадулінскай — падарунак Тадэвуша Агінскага. Манастыр (праваслаўны Свята-Успенскі Тадулінскі) быў зачынены ў 1918 г. Тады, хутчэй за ўсё, знік і цудадзейны абраз.

Міхал Клеафас Агінскі атрымаў Тадулін у спадчыну ад дзядзькі Францішка Ксаверыя і прадаў у 1815 г. «для удовлетворения оставшихся на нём долгов и прочих через войну разоренных имений…», не забыўшыся пра тры апякаемыя ім манастыры (тадулінскі, віцебскі бернардынскі і станькаўскі карміліцкі), якім пакупнік абавязаны быў выплаціць агулам 3 тыс. рублёў срэбрам. Новы гаспадар таксама павінен быў аставіць базыльянам мыс на возеры для рыбалоўства.



# Аборак

## (Маладзечанскі раён, Мінская вобласць)

У XVIII ст. у Аборку знаходзіўся цэнтр вялікага маёнтка, што належаў роду Агінскіх. Дарэчы, вядомы на ўсю акругу касцёл Узнясення Дзевы Марыі і Святога Роха ўзведзены яшчэ ў 1443 г. Яго адбудаваў у 1773 г. менавіта Францішак Ксаверый Агінскі, у якога ў 1793 г. і набыў маёнтак Казімір Дэдэрка, дзед Леанарда Ходзькі — сакратара Міхала Клеафаса Агінскага. Свой род Ходзькі вядуць з часоў вялікага князя літоўскага Віценя. Як сведчыць легенда, у час бітвы з крыжакамі адзін з ваяроў выратаваў вялікага князя, пасадзіў яго на плечы і хуткай хадой вынес з поля бою. За гэта князь даў яму прозвішча Ходзька. Род Ходзькаў мае шмат выдатных прадстаўнікоў: Андрэй удзельнічаў у Грунвальдскай бітве, Рыгор прымаў у сваім маёнтку ў Заблудаве Івана Фёдарава і Пятра Мсціслаўца, якія ўцяклі з Масквы і выдалі дзякуючы гэтаму ўсім вядомыя «Евангелле вучыцельнае» і «Часаслоў», Ігнацый знайшоў славу доктара філасофіі і тэалогіі, Ян атрымаў пасаду прэзідэнта Мінскага земскага трыбунала, Іосіф — генерал-лейтэнант рускай арміі — быў цудоўным геадэзістам і тапографам, Аляксандр вывучаў усходнія і славянскія мовы, пісаў вершы. Але самым знакамітым прадстаўніком роду Ходзькаў быў Леанард, які нарадзіўся ў 1800 г. У 19-гадовым узросце ён становіцца сакратарам



Касцёл у Аборку. 1890 г.

Міхала Клеафаса Агінскага, даводзіць да ладу яго архіў. У Парыжы ў 1826 г. выдае мемуары кампазітара на французскай мове, а таксама двухтомнік вершаў Адама Міцкевіча на польскай мове, «Гісторыю польскіх легіёнаў», «Біяграфічныя нататкі з жыцця Тадэвуша Касцюшкі». Таксама стварае геаграфічныя карты Расіі, Польшчы, Прыбалтыкі, Беларусі, збірае 125 тамоў дакументаў па гісторыі Польшчы, Беларусі і Украіны. І менавіта беларуская зямля — вёска Аборак — дала свету такога слыннага дзеяча. Аднак тая невялічкая тэрыторыя, на якой знаходзіўся касцёл, абрасла бур'яном, а вяскоўцы зрабілі з яе сметнік. Фамільны склеп разрабаваны.

У 2015 г. намаганнямі Маладзечанскага дабрачыннага фонду «Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага» адноўлены рэшткі касцёла, добраўпарадкаваны склеп-пахавальня роду Ходзька-Дэдэркаў, адрэстаўравана брама, расчышчана кожная надмагільная пліта, адноўлены крыж і памятны знак, на якім быў умацаваны анёл — атрыбут Святога Роха.

Дарэчы, культ Святога Роха распаўсюдзіўся ў XV ст. у многіх краінах як апекуна пры заразных хваробах. У славянскай традыцыі Святога Роха шанавалі найперш як апекуна жывёлы, а таксама падарожнікаў, аптэкараў, урачоў, агароднікаў, шпіталяў, вязняў. Адзначым, што ў касцёле часта бываў контр-адмірал рускага флоту Іван Канаржэўскі, які лічыў Святога Роха заступнікам суднаходства. Афіцэр загадаў пахаваць сябе разам са сваімі сынамі на касцёльных могілках, што і было зроблена. Усяго ў гонар Святога Роха ва ўсім свеце пабудавана каля трох тысяч касцёлаў. У некаторых з іх праводзяцца набажэнствы, іншыя ляжаць у руінах.









Дзмітрый Сакалоўскі
**«Касцёл Святога Роха ў в. Аборак Маладзечанскага раёна»**
Палатно, алей. 40х65. 2015 г.




Частковая рэстаўрацыя
месца былога касцёла Святога Роха
і пахавання роду Ходзькаў – Дэдэркаў
здзейснілася па ініцыятыве дабрачыннага фонду
"Спадчына М.К. Агінскага" пры актыўнай
падтрымцы Маладзечанскага райвыканкама,
музычнага каледжа імя М.К. Агінскага і
наступных арганізацый г. Маладзечна
і Маладзечанскага раёна:
БФ "Барыт", БК "АІС",
БФ "МІГ-ЛТД", ІП В.І. Рак
ПАВА Мінскага абласнога ўпраўлення МНС
КУП "Маладзечнавадаканал"
ДРБУ N195 філіял КУП "Мінскаблдарбуд"
Філіял ДЭУ N63 РУП "Мінскаўтадар-Цэнтр"
ДЛГУ "Маладзечанскі лясгас"
"Маладзечанскія электычныя сеткі"
ТАА "Сучасныя тэхналогіі сувязі"
ААТ "Спецбудмеханізацыя"
ААТ "ПМК-221", ААТ "Будаўнік-197"
Палачанскага сельвыканкама
Палачанскай сярэдняй школы
ААТ "Палачаны", АБЗ "Палачаны"
Маладзечанскага дзяржаўнага каледжа
ТАА "Бізнэс цэнтр саюз партнер"
Вернікаў вёсак Аборак і Палачаны
Вялікі дзякуй Вам, добрыя людзі!
Старшыня Маладзечанскага
райвыканкама А. Яхнавец
Старшыня Праўлення
Фонду Р. Сарока







# Канал Агінскага
## (Дняпроўска-Нёманскі канал)

Каморнік Вальтэр, які рабіў у 1765 г. зямельныя вымярэнні ў ваколіцах Целяханаў, першым звярнуў увагу на магчымасць злучэння рэк Ясельды і Шчары праз палескія балоты. Ён паведаміў пра свае думкі ўпраўляючаму пінскімі ўладаннямі Тадэвушу Нарбуту. Той з дапамогай мечніка Пінскага павета Мацея Бутрымовіча склаў праект канала і даслаў вялікаму гетману Міхалу Казіміру Агінскаму. Задума зацікавіла яго не толькі з эканамічнага, але і эстэтычнага боку магчымасцю злучыць Балтыйскае і Чорнае мора, а таксама ажыццявіць мару пра «плывучы тэатр». Да таго ж імпанавала ідэя аб’яднаць водным шляхам свае спадчынныя ўладанні: Слонім і Целяханы. Трэба адзначыць, што ў маладыя гады Міхал Казімір моцна пацярпеў ад дрэнных палескіх дарог: яго карэта з каштоўным багажом звалілася ў ваду з расхістанага моста. Страты склалі некалькі тысяч дукатаў. Насуперак першапачатковаму праекту правесці канал па самых нізкіх месцах Агінскі запатрабаваў зрабіць яго непасрэдна праз Целяханы, дзе



будаваў сваю рэзідэнцыю. Караблі павінны былі праплываць пад высокай аркай, а на берагах планавалася пасадзіць вялікі сад, разбіты на чатыры часткі, як сімвалы чатырох стыхій: зямлі, вады, паветра і агню.

Яшчэ да пачатку будаўніцтва канала былі пракладзены дзве сухапутныя дарогі з Пінска на Слонім і Валынь. У 1769 г. пачаліся работы па ачышчэнні рэчышча Нёмана. Адначасова ў Слоніме разгарнулася праца па асушэнні балоцістых зямель уздоўж Шчары і спрамленні яе рукава ў межах горада. Пазней гэты ўчастак ракі атрымаў назву Малы Агінскі канал. Мэта менавіта гэтай воднай пабудовы выявілася ў з'яўленні на ёй «Плаваючага тэатра», спраектаванага гетманам Агінскім. Летам 1771 г. тэатр здзейсніў некалькі пастановак опер і камедый.

Тэмпы будаўніцтва канала замарудзіліся пасля ўдзелу М. К. Агінскага ў вайне з Расіяй (1771) і вымушанай эміграцыі. Толькі ў 1775 г. праца аднавілася з дапамогай дзяржавы. У гэтым жа годзе пачаўся сплаў па канале. Пасля далучэння ВКЛ да Расіі былі праведзены інжынерна-геадэзічныя работы і добраўпарадкаванне тэрыторыі. Па канале сплаўлялі лес (плыты расцягваліся на 30 міль ад р. Ясельды да Слоніма), везлі збожжа з Украіны, сыравіну на мануфактуры Польшчы і Прусіі. Канал пацярпеў у часы Першай сусветнай і савецка-польскай войнаў. Адноўлены ў 1926–1928 гг., працаваў да 1941 г. у асноўным для лесасплаву і крыху для суднаходства. У 1943 г. тут адбыўся вялікі бой («Агінскі бой») паміж партызанамі і немцамі, у выніку якога плаціны і шлюзы былі разбураны і больш не аднаўляліся.

Канал, які злучыў Нёман з басейнам Дняпра, называюць цудам інжынернай думкі XVIII ст. Пачатая ў наш час рэканструкцыя вядзецца даволі павольна, пакуль адноўлены толькі ўчастак ад Выганашчанскага возера да в. Выганашчы.














Фота Сяргея Плыткевіча

# Укладальнікі

*Сапоцька Павел Міхайлавіч —*
старшыня Апякунскага савета
Мясцовага дабрачыннага фонду
«Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага»,
кіраўнік Цэнтра міжкультурнага дыялогу
і сацыяльных ініцыятыў
Рэспубліканскай канфедэрацыі прадпрымальніцтва.

*Сарока Рыгор Сямёнавіч —*
заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь,
старшыня Праўлення Мясцовага дабрачыннага фонду
«Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага»,
мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор
Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь
Сімфанічнага аркестра Маладзечанскага дзяржаўнага
музычнага каледжа імя М. К. Агінскага.

# Аўтары

*Кляшчонак Тацццяна Іванаўна —*
навуковы супрацоўнік дзяржаўнай гісторыка-культурнай установы «Музей-сядзіба Міхаіла Клеафаса Агінскага».

*Бурэнь Валерый Васільевіч —*
кіраўнік аддзела гісторыі, краязнаўства і турызму Мясцовага дабрачыннага фонду «Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага».

*Тамашэўскі Мікалай Іванавіч —*
член Праўлення Мясцовага дабрачыннага фонду «Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага».

# Змест


*Ад укладальнікаў. Р. С. Сарока, П. М. Сапоцька* . . . . . . . . . . 5

ЗАЛЕССЕ
(Смаргонскі раён, Гродзенская вобласць) . . . . . . . . . . 8

БЕШАНКОВІЧЫ
(Віцебская вобласць) . . . . . . . . . . 28

МАЛАДЗЕЧНА
(Мінская вобласць) . . . . . . . . . . 30

МАЁНТАК БАКШТЫ
(Смілавічы і Дукора) . . . . . . . . . . 36

БЕНІЦА
(Маладзечанскі раён, Мінская вобласць) . . . . . . . . . . 42

БЯЛЫНІЧЫ
(Магілёўская вобласць) . . . . . . . . . . 46

ВІЦЕБСК . . . . . . . . . . 53

ГАНУТА
(Вілейскі раён, Мінская вобласць) . . . . . . . . . . 57

ГРОДНА . . . . . . . . . . 63

ДРЫСВЯТЫ І ПОШЧА
(Браслаўскі раён, Віцебская вобласць) . . . . . . . . . . 66

ЛУЧАЙ
(Пастаўскі раён, Віцебская вобласць) . . . . . . . . . . 68

СЛОНІМ
(Гродзенская вобласць) . . . . . . . . . . 73

СЯННО
(Віцебская вобласць) . . . . . . . . . . 77

ТАДУЛІН
(Віцебскі раён, Віцебская вобласць) . . . . . . . . . . 80

АБОРАК
(Маладзечанскі раён, Мінская вобласць) . . . . . . . . . . 81

КАНАЛ АГІНСКАГА
(Дняпроўска-Нёманскі канал) . . . . . . . . . . 88

*Укладальнікі* . . . . . . . . . . 91

*Аўтары* . . . . . . . . . . 92

*Навукова-папулярнае выданне*

**МАТЭРЫЯЛЬНАЯ СПАДЧЫНА
РОДУ АГІНСКІХ У БЕЛАРУСІ**

Укладальнікі:
САПОЦЬКА Павел Міхайлавіч,
САРОКА Рыгор Сямёнавіч

На вонкавым баку вокладкі выкарыстана работа
Напалеона Орды «Касцёл Святога Вінцэнта і кляштар місіянераў у Смілавічах» (1870-я гг.),
на тытульным аркушы — Дар'і Арловіч «Шляхамі М. К. Агінскага» (2017 г.)

У кнізе выкарыстаны фотаздымкі
з архіваў фонду «Спадчына Міхала Клеафаса Агінскага», выдавецтва «Чатыры чвэрці», а таксама
Сяргея Плыткевіча, Аляксандра Дзехцяронка, Галіны Рачко, Мечыслава Тарасевіча,
Максіма Тарналіцкага, Аляксандра Хітрова, Яўгена Стэльмаха, Валянціны Свірыда
і з інтэрнэт-крыніц

У мастацкім афармленні выдання выкарыстаны работы Напалеона Орды, Леанарда Ходзькі,
Дзмітрыя Струкава, Васіля Грыневіча, Віктара Мікіты, Дар'і Бунеевай, Галіны Бяганскай,
Аляксандра Грышкевіча, Уладзіміра Лукшы, Валяр'яна Янушкевіча, Эдуарда Мацюшонка, Дар'і Арловіч

Адказны рэдактар
АНЦУХ Ліліяна Фёдараўна

Рэдактар *Ж. Ю. Клімянок*
Дызайн і вёрстка *І. П. Бандаровіч*
Карэктары: *К. С. Голуб, М. Д. Ліпніцкая*
Адказны за выпуск *С. В. Анцух*

12+

Падпісана да друку 25.04.2022.
Фармат 60×84/12. Папера мелаваная. Друк лічбавы.
Ум. друк. арк. 7,44. Ул.-выд. арк. 7,42.
Тыраж 250 экз. Заказ 933.

*Якасць фотаздымкаў адпавядае*
*якасці прадстаўленых арыгіналаў.*

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
ТДА «Выдавецтва “Чатыры чвэрці”».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/139 ад 08.01.2014, № 3/219 ад 21.12.2013.
Вул. Б. Хмяльніцкага, 8-215, 220013, г. Мінск.
Тэл./факс: +375 17 350 25 42. E-mail: info@4-4.by



**Пане браце! Будзем разам**
**Славу продкаў ухваляць,**
**Каб любоў да родных ніваў**
**У нашых сэрцах зберагаць.**

**Г. Казлова, Т. Сінкевіч**

ISBN 978-985-581-522-9

Матэрыяльная спадчына роду Агінскіх у Беларусі